р-на Пскоўскай вобл., Расія — 23.2.1984), бел. акцёр. Нар. арт. Беларусі (1955). Скончыў Ленінградскі тэатр. ін-т (1939). Працаваў у Дзярж. рус. драм. т-ры Беларусі (1939—41, 1945—64). З 1964 у Маск. т-ры імя Маякоўскага. Выканаўца героіка-рамант. і характарных роляў. У творчасці спалучаў востры сцэн. малюнак з эмацыянальнасцю выканання. Сярод роляў у Дзярж. рус. драм. т-ры Беларусі: Фердынанд («Каварства і каханне» Ф.Шылера), Тэадора («Сабака на сене» Лопэ дэ Вэгі), Эдмунд («Кароль Лір» У.Шэкспіра), Тузенбах («Тры сястры» А.Чэхава), Барыс Гадуноў («Цар Фёдар Іаанавіч» А.К.Талстога), Камандзір карабля («Аптымістычная трагедыя» У.Вішнеўскага), Эдлай Гамільтан («Дзень нараджэння Тэрэзы» Г.Мдывані). Зняўся ў бел. кінафільмах «Чырвонае лісце», «Гадзіннік спыніўся апоўначы».

*Літ.*: Атрошчанка А. На шляху творчай сталасці // Майстры беларускай сцэны. Мн., 1960. *Г.Р.Герштэйн.*

**КАРНА́К** (стараж.-егіп. Іпет-Ісут), комплекс храмаў 20 ст. да н.э. — канца 1-га тыс. да н.э. на тэрыторыі стараж. г. *Фівы* і гал. дзярж. свяцілішча ў перыяд Новага царства ў Егіпце. Вылучаўся складанай планіроўкай гіганцкіх арх. мас, пышным убраннем. Храм бога Амона-Ра (16—12 ст. да н.э., дабудоўваўся ў элліністычны і рым. перыяды) — чаргаваныя па падоўжнай восі вял. і малыя залы, двары з рознымі па часе ўзвядзення капэламі і храмікамі. Гал. славутасць К. — грандыёзная шматкалонная гіпастыльная зала з каляровымі рэльефамі на сценах і калонах. Кожны вял. буд. перыяд завяршаўся ўзвядзеннем вакол храма сцяны з 2 пілонамі на фасадзе, фланкіраванымі статуямі і абеліскамі. У комплексе храмы бога Хансу (12 ст. да н.э.), багіні Мут (16—15 ст. да н.э.), алея сфінксаў. Сярод дойлідаў К. — *Аменхатэп Малодшы.*



Калоны гіпастыльнай залы ў **Карнаку**.

**КАРНАЛІ́Т** (ад імя ням. горнага інж. Р. фон Карналя), мінерал падкласа хларыдаў, водны хларыд калію і магнію, $KMgCl_3 \cdot 6H_2O$. Прымесі свінцу, цэзію, брому. Крышталізуецца ў рамбічнай сінганіі. Звычайна суцэльныя або зярністыя агрэгаты, часам таблітчастыя, дыпірамідальныя крышталі. Колер малочна-белы, прымесямі жалеза можа быць афарбаваны ў чырвоны, буры, жоўты колеры. Бляск тлусты. Празрысты да паўпразрыстага. Цв. 2,5. Шчыльн. 1,6 г/см$^3$. Вельмі гіграскапічны. Па паходжанні хемагенны, трапляецца разам з *галітам, сільвінам* і інш. галоідамі. Рудаўтваральны мінерал *калійных солей.* Сыравіна для вырабу калійных угнаенняў, метал. калію і магнію. На Беларусі выяўлена радовішча К. ў Прыпяцкай упадзіне.



**Карналіт.**

**КАРНАП** (Carnap) Рудольф (18.5.1891, г. Вуперталь, Германія — 14.9.1970), нямецка-амерыканскі філосаф і логік, вядучы прадстаўнік *лагічнага пазітывізму* і філасофіі навукі. Удзельнік *Венскага гуртка* і распрацоўкі ідэй лагічнага эмпірызму. Працаваў ва ун-тах Еўропы, у 1936—52 у Чыкагскім, Каліфарнійскім ун-тах. Распрацоўваў пераважна фармалізаваную тэорыю індуктыўнай, семантычнай і мадальнай логік. Прадметам філасофіі навукі лічыў аналіз структуры прыродазнаўчанавук. ведаў з мэтай удакладнення асн. паняццяў навукі з дапамогай матэм. логікі. Філасофія, паводле К., складаецца з вытлумачэння зместу паняццяў часу і адначасовасці з'яў. У апошнія гады жыцця К. выказваўся на карысць існавання «неназіральных матэрыяльных аб'ектаў», фармуляваў сцвярджэнні, блізкія да прыродазнаўчанавук. матэрыяліст. традыцыі. Шэраг вынікаў, атрыманых К., выкарыстаны ў даследаваннях па кібернетыцы.

*Тв.*: Рус. пер. — Значение и необходимость. М., 1959; Философские основания физики: Введение в философию науки. М., 1971. *В.М.Пешкаў*

**КАРНАТЫ́Т** (ад імя франц. вучонага А.Карно), мінерал падкласа ванадатаў, водны ванадат калію і урану, $K_2(UO_2)_2[VO_4]_2 \cdot 3H_2O$. Крышталізуецца ў манаклінная сінганіі. Структура субслаістая. Звычайна зямлістыя масы, зярністыя і парашкаватыя агрэгаты. Колер жоўты да зеленавата-жоўтага. Бляск цьмяны да зямлістага. Цв. 2—2,5. Шчыльн. 5 г/ см$^3$. Моцна радыеактыўны. Другасны мінерал, утвараецца ў зоне акіслення асадкавых радовішчаў. Руда ўрану, радыю, ванадыю.



**Карнатыт.**

**КАРНА́Ч** Пётр Аляксеевіч (1.5.1932, в. Клінок Чэрвеньскага р-на Мінскай вобл. — 25.8.1996), бел. мастацтвазнавец, мастак. Канд. мастацтвазнаўства (1967). Скончыў Бел. тэатр.-маст. ін-т (1955). З 1961 працаваў у Ін-це мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору АН Беларусі. Даследаваў пытанні тэорыі і практыкі тэатр.-дэкарацыйнага мастацтва. Аўтар тэксту і складальнік альбома «Мастацтва беларускіх дэкаратараў» (1989), манаграфій пра бел. мастакоў: «С.Ф.Нікалаеў» (1970), «П.В.Масленікаў» (1973), «Я.Чамадураў» (1984) і інш., артыкулаў для «Гісторыі мастацтва народаў СССР» (т. 8—9, 1977—82), «Гісторыі беларускага мастацтва» (т. 3—6, 1989—94). Працаваў у пейзажным жывапісе: «Лагойскі матыў» (1975), «Сонечны дзень» (1980), «Зімовы пейзаж» (1981), «Напралвесні» (1988). Дзярж. прэмія Беларусі 1996.

*Тв.*: Дэкарацыйнае мастацтва музычнага тэатра БССР. Мн., 1973. *Р.Ф.Шаура.*

**КАРНА́Ч** Сцяпан Андрэевіч (10.11.1918, в. Клінок Чэрвеньскага р-на Мінскай вобл. — 6.2.1991), Герой Сав. Саюза (1944). Ген.-м. авіяцыі (1957). Скончыў Мінскі аэраклуб (1938), Адэскую ваен. авіяц. школу лётчыкаў (1940), Вышэйшыя лётна-тактычныя курсы (1949), Ваен. акадэмію Генштаба (1958). У Чырв. Арміі з 1938. У Вял. Айч. вайну з 22.6.1941 на Паўд., Крымскім, Закаўказскім, Варонежскім, Сцяпным, 2-м і 1-м Укр. франтах: камандзір звяна, эскадрыллі, штурман палка, нам. камандзіра, камандзір знішчальнага авіяпалка. Удзельнік абароны Севастопаля, баёў у Крыме, на Каўказе, Белгарадска-Харкаўскай аперацыі, баёў на Украіне, у Польшчы, Германіі, Чэхаславакіі, штурму Берліна. Зрабіў 346 баявых вы-